Аўторак, 12 снежня

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.40** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.20 Зона Х. (16+).
9.10, 22.10 Серыял «След». (16+).
10.55, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Жэмчугі». (16+).
13.10 Дзіцячы доктар.
13.45 Дзень у вялікім горадзе.
14.45, 15.25 Серыял «Райскае месца». (16+).
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка.
21.00 Панарама.
21.50 Спецыяльны рэпартаж. (12+).
0.00 Сфера інтарэсаў.
1.00 Дзень спорту.

Беларусь 2

7.00 Тэлераніца. (12+).
9.00, 19.05 Тэлебарометр.
9.05, 17.05 Серыял «Жанчына ў чорным». (16+).
11.00, 22.05 «Багіня шопінгу». (16+).
12.00, 21.10 «Тата зможа?» (16+).
12.55, 19.10 «Амерыканскі жаніх». (16+).
14.00 «Бітва салонаў». (16+).
15.10, 23.00 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме». (16+).
16.15, 23.50 Нічога сабе ньюз. (12+).
16.20, 23.55 «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
20.05 «Паненка-сялянка». (16+).
22.00 Спортлато 6 з 49, КЕНО.

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Бульбяныя дзедкі.
8.05, 12.00, 20.00 «Калейдаскоп». Навіны культуры.
8.20, 12.15, 23.45 «Гэты дзень».
8.25, 18.35 «Пётр Лешчанка. Усё, што было...» Маст. фільм. (16+).
9.20, 17.55 «Апошні дзень». Спартак Мішулін (12+).
9.55 «Святло далёкай зоркі». Памяці пісьменніка, заслужанага работніка культуры БССР Івана Пташнікава.
10.25 «Выкрасці Бельмандо». Маст. фільм. 1—2-я серыі (12+).
12.20 «Старыя казкі».
12.45 «Сінематэка». Беларускае кіно 90-х гадоў.
13.30 «Свет Караткевіча». Дак. фільм (12+).
13.55 «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял (16+).
15.35, 21.05 «Дзяржаўная граніца». «Год сорак першы» (12+).
19.30 «Ваша лато», «Пяцёрачка».
20.15 «Беларуская кухня». Яечня і драны блін.
20.40 «Калыханка» (0+).
23.25 «Песні пад гітару».

5 Беларусь 5

8.00 Футзала. Кубак Мытнага саюза. «Меркурый-ДМК» (Брэст) — зборная Расіі.
9.20 Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Слован» (Браціслава).
11.25, 13.20, 14.30, 22.40 Спорт-мікс.
11.35 Час футбола.
12.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
13.30 Піт-стоп.
14.00 Легенды спорт. Беларускія гісторыі. Раман Васілюк.
14.40 Змешаныя адзінаборствы. UFC.
16.50, 19.55 Футбол. Клубны чэмпіянат свету. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
18.55 Гульні «навыраст».
19.25 Спорт-кадр.
21.55 Спорт-цэнтр.
22.05 Трэніровачны дзень.
22.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Хадэрсфілд» — «Чэлсі». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

АНТ

6.00, 6.30, 7.00 (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.10, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
9.10 Ток-шоу «Наша жыццё».
10.00 «Жыць здорава!» (12+).
11.05, 13.05, 16.15, 18.15 (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
11.10 «Модны прыгавор» (12+).
12.20, 13.10, 19.00 «Няхай гавораць» (16+).
13.55 «Давай пажэнімся!» (16+).
14.55 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
16.20 «Спартклуб» (12+).
16.55 «На самай справе» (16+).
18.20 «Кантрольная закупка» (12+).
18.55 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
20.00 Час.
21.05 Серыял «Другі зрок». (16+).
23.05 «Вячэрні Ургант» (16+).
23.40 Начныя навіны.
23.55 «Час пакажа» (16+).

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Мінішчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
7.40, 20.10, 23.00 «СТБ-спорт».
8.30, 18.35 «Тайны Чапман» (16+).
9.15 Камедыя «Сардэчна запрашаем, або Пабочным асобам уваход забаронены» (6+).
10.40, 23.25 «Дэпартамент». Серыял (16+).
12.30 «Загадкі чалавецтва» (16+).
13.50 Меладрама «Непрыстойная прапанова» (16+).
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
16.50 «Салдаты і афіцэры». Серыял (16+).
17.35 «Разведчыцы». Серыял (16+).
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Трылер «Аварыя» (16+).
21.50 «Глядзець усім!» (16+).
23.05 «Аўтапанарама» (12+).
1.05 Muse: канцэрт на Алімпійскім стадыёне ў Рыме (16+).
2.40 «Калі мы былі юныя». Канцэрт Вадзіма Касенкі (12+).

МІР

7.30 «Добрай раніцы, свет!» (16+).
8.35 «Няма праблем» (16+).
10.00 «Любімыя акцёры» (12+).
10.30, 13.15 Серыял «Мамадэтэктыў». (12+).
13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
14.00, 3.00 «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2». (16+).
19.20 Серыял «Маша ў законе-2». (16+).
21.15 Серыял «Аддзел 44». (16+).
23.10 Маст. фільм «Ніякі род, адзіночны лік» (16+).
1.00 Маст. фільм «Астравы» (12+).
4.00 Серыял «Мафіёза». (16+).

РТР—Беларусь

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40, 22.30, 23.10 Серыял «Тайны следства-17». (12+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.35 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
15.45 «60 хвілін». Ток-шоу .
17.35 «Лёс чалавека». (12+).
18.45 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
20.35 Серыял «Марозава». (12+).
22.10 «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
0.30 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.10, 7.05 «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
7.50, 8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).
9.40, 23.30 «НЗ.by».
10.25 Серыял «Падазраюцца ўсе». (16+).
11.00 Серыял «Сведкі». (16+).
12.00 «Суд прысяжных». (16+).
13.25, 18.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.05 Серыял «ППС». (16+).
16.30 «Спецыяльны выпуск». (16+).
17.30 Серыял «Мянтоўскія войны». (16+).
19.40 Серыял «Чужы твар». (16+).
21.35 Серыял «Пакараць смерцю нельга памілаваць». (16+).
23.50 «Вынікі дня».
0.20 Серыял «Версія». (16+).

8 канал

7.00, 16.05, 19.45, 21.00, 23.55 «Надвор'е».
7.05 «Сябры дзядулі Марка» (0+).
7.25 Для дзяцей «Адказвайка».
7.30 Раніца на восьмым.
10.30 «Мой любімы гадаванец» (0+).
11.00 Трылер «Прысяжная».
13.00 Серыял «Жорсткае каханне».
14.30 Серыял «Прыгоды маладога Індыяны Джонс».
16.10 «Мультпарад».
17.50 Серыял «Сталічны дом».
18.55 Серыял «Давяраю табе».
19.50 Серыял «Свой сярод чужых».
20.50 «Вечарніца».
21.05 «Даведнік па краінах і кантынентах».
21.15 Трылер «Падзенне».
23.05 Серыял «Каханне каля возера».

ВТБ

6.00, 15.15 Серыял «Вароніны». (12+).
7.20 «Дурні і дарогі». (16+).
7.40, 4.20 М/ф «Дуда і Дада». (0+)
8.00, 4.30 М/ф «Смяшарыкі». (0+)
8.20, 4.50 М/ф «Маша і Мядзведзь». (6+)
8.50, 3.50 «Ералаш». (6+)
9.30 Серыял «Сямейны бізнес». (12+).
10.40 Баявік «Няўлоўныя». (16+).
12.30 Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
13.00, 19.00 Серыял «Псіхалагіні». (16+).
14.10, 20.10 Серыял «Атэль «Элеон». (16+).
16.45, 5.10 Серыял «Ранеткі». (12+).
17.50, 23.00 «Уральскія пельмені». (16+).
21.20 Баявік «Няўлоўныя: апошні герой». (16+).
0.00 Серыял «Васьмідзясятыя». (16+).
0.50 Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
1.50 Серыял «Закрытая школа». (16+).
3.30 «Лаві момант». (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.00, 23.45 Навіны культуры.
6.35 Пернікавы домік. «Звяры і птушкі».
7.05 «Легенды сусветнага кіно». Алена Кузьміна.
7.35 «Пешшу...» Масква кніжная.
8.05, 21.10 «Правілы жыцця».
8.35, 22.55 «Абацтва Даўнтан». Маст. фільм.
9.30 «Мхатчыкі. Тэатр часоў Алега Яфрэмава».
10.15, 18.00 «Назіральнік».
11.10, 0.40 XX стагоддзе. «Аляксандр Салжаніцын». Дак. фільм. Частка 2-я.
12.20 «Майстэрня архітэктуры». Пра бачанне.
12.45 «Джэк Лондан». Дак. фільм.
12.55 «Саці. Нясумная класіка...»
13.35 «Віктар Папкоў. Суровы анёл». Дак. фільм.
14.15 «Магія шкла». Дак. фільм.
14.30, 22.20 «Палацы ўзарваць і адыходзіць...»
15.10 Да юбілею кампазітара. Творы Радзівона Шчадрына ў выкананні ДАСА Расіі імя Я. Ф. Святланава.
16.15 Важныя рэчы. «Берэт Фідэля Кастра».
16.30 «2 Вернік 2».
17.20 «Рэвалюцыя і канстытуцыя, або Міна запаволенага дзеяння». Дак. фільм.
19.00 «Эрмітаж».
19.45 Галоўная роля.
20.05 Прыступкі цывілізацыі. «Эвалюцыя чалавека. Як мы тут апынуліся?» Дак. фільм.
20.55 «Добрай ночы, малыя!»
21.40 Штучны адбор.
0.00 «Тым часам».
1.45 Элісо Вірсаладзэ ў Вялікай зале Маскоўскай кансерваторыі.
2.40 «Pro memoria». «Водбліскі».

Настальгія

6.00 «Сустрэча ў канцэртнай студыі «Астанкіна» з Дзмітрыем Ваўкагонавым. 1990 год (16+).
7.40 «Канцэрт Тота Кутуньё». 1985 год (12+).
8.30, 1.00 «Вакол смеху». 1980 год (12+).
9.15, 11.10, 14.40, 15.40, 17.00, 20.40, 21.40, 23.00, 0.45, 1.40, 5.45 Музычная настальгія (12+).
9.35 «... жадаем шчасця вам». Фільм-канцэрт. 1985 год (12+).
10.00 Маст. фільм «Будзь здароў, дарагі!» (16+).
11.30 Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі». (16+).
12.00 Фільм-спектакль «Дзядзька Ваня». 1986 год (16+).
15.00, 21.00 «Мінулы час» (12+).
16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
17.55 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Першыя кааператывы». 2005 год (12+).
19.00 Тэлеспектакль «Шалёныя грошы». 1968 год (16+).
0.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1966. 2-я частка. 2009 год (16+).
1.55 «Што? Дзе? Калі?» Першы паўфінал 1982 года (12+).
3.00 «Быў час». 2008 год (16+).
4.00 Маст. фільм «Толькі ў мюзік-холе». (16+).
5.05 «У гасцях у М. Магамаева». Лайза Мінэлі. 1992 год (16+).

EuroSport 1

3.30, 2.00 Скачкі з трампліна. Кубак свету.
5.00, 9.00, 15.45, 23.45 Снукер. Scottish Open.
6.30, 12.00 Біятлон. Кубак свету.
7.30 Веласпорт (трэк). Кубак свету.
10.30 Фехтаванне. Серыя Гран-пры.
11.35, 15.00 Зімовыя віды спорту. «Sports destination».
12.55 Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй». Ліндсі Вон.
13.00 Фігурнае катанне. Фінал. Гран-пры.
15.30, 20.00 Футбол. «ФІФА».
20.30 Конны спорт. Кубак свету.
21.30 «Найлепшае з коннага спорту».
22.00 Фрыстайл. Кубак свету.

Кінакамедыя

0.40 Камедыя «Паміж анёлам і чортам». (16+).
2.55 М/ф «Іван Царэвіч і Шэры Воўк-3». (6+).
4.25 Шоу «Камедыянты». (16+).
4.55 Скетчкам «Паміж намі». (16+).
5.15 Камедыя «Сёння ў меню». (16+).
7.10 Меладрама «Звычка расставацца». (16+).
8.40 Камедыя «Прыкінься маім мужам». (16+).
10.35 Меладрама «Хочаш ці не?» (16+).
12.15 Камедыя «Вампіршы». (16+).
14.00 Камедыя «Душэўная кухня». (16+).
15.55 Камедыя «Старая добрая оргія». (16+).
17.40 Баявік «Асабліва небяспечная». (16+).
19.30 Камедыя «Тупы і яшчэ тупейшы-2». (16+).
21.25 Камедыя «Усё магу». (16+).
23.00 Камедыя «Паляўнічы на тыгра». (16+).

ТБ3

6.00 М/ф (6+).
7.50 «Доктар І...» (16+).
8.20 «Трэндзі» (16+).
8.50, 19.00, 2.30 «Кузей. Гюней». Серыял (16+).
10.25, 4.05 «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
12.00, 18.00 «Сляпая» (12+).
13.00, 16.55 «Варажбітка» (12+).
14.05 «Паралельны свет» (12+).
15.00 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
15.35 «Здзелка» (16+).
16.05 «Натуральны адбор» (12+).
20.50 «Тайныя знакі. Зніклыя знакамітасці» (16+).
21.45 «Рэвізора» (16+).
22.50, 5.35 «Гісторыі выратавання» (16+).
23.20 «Візіцёры». Серыял (16+).
0.05 «Крымінальнае чытво». Трылер (18+).

ТБ1000

6.10, 17.40 Дзіця на $30 000 000. (16+).
8.35 Зімовая спячка. (12+).
12.15 Застанься са мной. (16+).
14.05 Акадэмія вампіраў. (12+).
16.05 Адна сустрэча. (16+).
20.10 Лізавета. (16+).
22.30 Гонка. (16+).
0.50 Карабель-прывід. (16+).
2.25 Геній. (18+).
4.15 Пакуль не сыграў у скрыню. (12+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Вайна полаў (16+).
8.10 Агні прытона (16+).
10.20 Якая бяжыць па хвалях (12+).
12.55 Пастарайся застацца жывым (16+).
14.20 Дом на абочыне (16+).
16.20, 4.20 Была табе каханая... 1—2-я серыі (16+).
18.20 Горка! (16+).
20.35 Тэрмінова выйду замуж (16+).
23.00 Маёр (18+).
1.00 Эластыка (16+).
2.45 Кіно пра Аляксеева (12+).

National Geographic

6.00 Займальная навука. (12+).
7.35, 18.00, 21.05, 0.50, 3.55, 5.30 Навуковыя недарэчнасці. (12+).
8.00 Сапраўдны суперкар. (12+).
8.45 Ледзяная дарога. (12+).
9.30 «Тытанік: праз 20 гадоў». (12+).
10.20 Мегазаводы. (12+).
11.05 Шаша праз пекла. (16+).
11.50, 17.10, 20.20 Аўта-SOS. (12+).
12.35 Пачатак. (12+).
13.25 Гульні розуму. (12+).
14.10 Узлом Сістэмы. (16+).
14.55 Смага. (12+).
15.40 Супербудаванні Трэцяга рэйха. (12+).
16.25, 19.30, 0.05, 2.20 Расследаванні авіякатастроф. (12+).
18.45 Праз мільён гадоў. (12+).
21.50, 1.35, 4.45 Зорная размова. (16+).
22.35 Космас: прастора і час. (12+).
23.20 Паранармальнае. (16+).

Discovery

8.00, 17.00, 22.00, 4.40 Махінатары. (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 6.20 Як гэта ўстроена? (12+).
10.00, 16.00, 23.00, 3.50 Паляўнічыя на склады. (16+).
11.00, 18.00, 5.30 Хуткія і гучныя. (16+).
14.00, 7.10 Голыя і напалоханыя. (16+).
19.00, 2.00 Залатая ліхаманка. (16+).
20.00 Мільёны Пабла Эскабара. (16+).
0.00 Мяцеж. (16+).
1.00 Самагоншчыкі. (16+).

Бяспечная гавэнда за бюркам

Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:

Памяце́льнік — палка, на якую прывязваюць венік.

Бяспе́чны — які нічым не пагражае.

Зухава́ты — бойкі, бравы, энергічны. *У «Новай зямлі» Якуба Коласа чытаем:*

Які ён важны, панаваты, выдатны, «мо́ндры», зухаваты!

Гавэ́нда — гутарка, размова. *Слова, дарэчы, з польскай мовы, дзе яно абазначае фальклорны жанр, што нарадзіўся з застольных размоў шляхціча́ў.*

Калю́шкі — ігліца хвойных дрэў.

Бюрка — пісьмовы стол. *Параўнайце беларускае слова «бюрка» з польскім «biurko», што значыць — стол з шуфлядкамі або шкафчыкамі.*

Хоць разарвіся — 1) так гавораць, калі неабходна рабіць адразу некалькі спраў; 2) нічога не атрымліваецца, нягледзячы на старанне. *Беларускія адпаведнікі: дыхнуць няма калі, хоць памры, хоць лопні. Рускі: хоть на куски разорвись.*

Разлюлі-маліна — 1) вельмі добры, выключны (пра чалавека); 2) вельмі добра, надзвычайна нешта зрабіць. *Беларусы яшчэ скажуць: на ўсе сто, як мае быць, на дзіва. Рускія: любо-дорого, хоть куда.*

Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

■ Тэлесеткі

ШТУРШОК ДЛЯ БІЗНЕСУ

Днямі на тэлеканале АНТ фінішаваў трэці сезон сацыяльна-адукацыйнага праекта «Мой бізнес». Перамога, а таксама галоўны прыз памерам у 20 тысяч беларускіх рублёў, паводле рашэння гледачоў, дасталіся ўрачу, кандыдату навук Уладзіславу Лукашэвічу — аўтару бізнес-ідэі TRiNiTi, унікальнага трэнажора для аднаўлення рухальных функцый пасля перажытага інсульту або цяжкіх траўмаў.

Сваю падтрымку TRiNiTi тэлегледачы выказалі ў інтэрактыўным галасаванні — праект атрымаў 9374 галасы (усяго ж паступіла каля 30 тысяч званкоў). «Мы зрабілі яшчэ адзін маленькі крок на шляху да глабальнай мэты — зрабіць дабро тым, хто мае ў ім рэальную патрэбу, стварыць даступную навукова абгрунтаваную рэабілітацыю», — сціпла пракаментаваў поспех Уладзіслаў Лукашэвіч, падзякаваўшы свайму ментару — намесніку старшыні праўлення «Беларусбанка» Аляксандру Паліўку, камандзе тэлеканала і ўсім, хто падтрымліваў і перажываў за яго.

Нагадаем, у трэцім сезоне тэлепраекта «Мой бізнес» заяўкі на ўдзел падало амаль 800 прадпрымальнікаў з усіх рэгіёнаў Беларусі, толькі 60 з іх пасля папярэдняга адбору атрымалі шанц прадставіць свае ідэі вопытным бізнесменам — ментарам, 24 удзельнікі атрымалі кансультацыйна-аналітычную падтрымку сваёй справы і ўключыліся ў шматмесячны марафон па рэалізацыі самых смелых задумак, і ўсяго шэсць у фінале спаборнічалі за галоўны прыз. З моманту запуску праграмы праз тэлевізійныя бізнес-курсы прайшло звыш 2300 айчынных прадпрымальнікаў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.